№№115–116
(2843–2844)

7жніўня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

ТЕМА ДНЯ

Что там, на полях?

Хозяйства Беларуси уже собрали около четырех миллионов тонн зерна. Урожайность зерновых нынче опережает прошлогодний уровень примерно на 6,5 центнера и составляет почти 37 центнеров с гектара.

По словам первого заместителя министра сельского хозяйства и продовольствия **Надежды КОТКОВЕЦ**, если раньше мы импортировали до 2 млн тонн фуражного зерна, то в году текущем его покупать скорее всего не придется. Этот вывод мотивирован хорошим созревшим урожаем. По предварительным оценкам — около 8 млн тонн зерна. При этом госзаказ продовольственного зерна составляет 1 млн тонн.

Чтобы свести потери к минимуму, жатва должна быть завершена в основном к 20 августа. Поэтому уборочный конвейер должен на каждом этапе работать без сбоев. К сожалению, по информации, поступающей с мест в Минсельхозпрод, много нареканий вызывает работа зерноуборочной техники лидского производства, а в дилерских центрах лидчан зачастую нет нужных запчастей. В результате — комбайны в случае поломки простаивают по нескольку дней, хотя теперь действительно дорога каждая минута!

Заготовку зерна сдерживает и работа центровывоза. Поэтому, уверены в Минсельхозпроде, свое плечо должны активнее подставлять промышленные и перерабатывающие предприятия, военные.

Итак, в тройку лидеров жатвы сегодня входят хозяйства Минской области, где намолочено около миллиона тонн зерна. На втором месте — сельхозорганизации Гомельщины, на третьем — хозяйства Брестской области.

Игорь ГРИШАН.

КАМЕРТОН

от Сергея Ваганова

Часовня на родниках

В минувшее воскресенье отмечались шесть десятилетий жизни художника Бориса Цитовича.

Больше половины этой жизни прошло в деревне Забродье Вилейского района, где Цитович поселился с женой Валентиной, театральным режиссером по образованию и призванию, а также труженицей, крестьянкой и верным другом по таланту своего человеческого естества. Там же, в Забродье, родился у них сын Данила, уже тоже художник, скульптор, мастер по любому механизму, дереву и железу, но прежде всего, конечно, сын...

Вот в этой деревне, где всего-то с десяток живых дворов, собрались художники, артисты, священники, музейные работники из Вилейки, деревенские люди из Забродья и разных других мест — друзья Цитовичей, несколько десятков человек, если не все сто.

Общественный интерес к жизни Цитовичей, выражаемый газетными публикациями и документальными фильмами, накатывал волнами, но без особой практической пользы для их дел. Сначала он вызывался экзотичностью факта: горожане по происхождению и воспитанию, они сами (!), без государственного принуждения, уехали в деревню, что, с одной стороны, вызывало подозрения и пересуды, а с другой — считалось подвигом и продолжением народнических традиций.

На самом деле они искали себя в жизни не по лжи, в неучастии во лжи — так формулировал кредо честного советского человека, возможность для него оставаться честным Солженицын, вспоминаемый сегодня по известной печальной причине особенно часто. Даже глава государства, в котором *дзержинщина* **на каждом шагу, пособолезновал "родным и близким выдающегося писателя и общественного деятеля"...**

У меня нет права утверждать, что Цитовичи осознанно искали смысл Богом данной им жизни по Солженицыну. Но, как, увы, немногие в те времена, они не струсили на краю открывшейся их поколению пропасти правды, не испугались, скажу по-другому, ее космической высоты. И очень скоро, если не сразу, неучастие во лжи оказалось для них невозможным без участия в правде.

Свое участие в правде они нашли в детях, стариках, земле, истории и искусстве. Создав при сельсоветском Доме культуры изостудию и кукольный театр "Ялінка", они постигали правду с детьми. Посадив на берегу Нарочанки рощу, где каждое дерево — имя и память о погибшем и ушедшем ветеране мировых войн, они учились правде у Истории. Растут в этом "Палисаде Победы" и деревья, посаженные Алесем Адамовичем и Василем Быковым — у них они тоже учились правде. Взвалив на себя все заботы о забродских стариках, они постигали кровную связь с их землей, приникли к ней, а потом и она проникла в их душу, тоже став их правдой. Найдя в ближнем лесу то, что осталось от кладбища, где хоронили погибших и умерших от ран солдат Первой мировой, они вырвали у забвения имена и могилы, сложили памятник, поставили кресты...

Сегодня их главная и, похоже, пожизненная забота — музей Первой мировой войны. Глобальный проект, охватывающий огромную территорию, от Вилейки до Сморгони и Нарочи, называемую "театром военных действий", то есть жесточайших, вплоть до газовых атак, боев...

Об этом было уже немало публикаций в прессе, в том числе государственной, если еще писать, то, конечно, не скорописью. Но, знакомясь с тем, что Цитовичи уже сделали, поневоле задаешься вопросом: почему власть и церковь, благословившая, к слову, начинание, столь нерасторопны в помощи делу Цитовичей, материальной, разумеется, прежде всего? Не потому ли, что нет в этом выгоды для них, идеологического первенства, нет "славы русского оружия", официозной героики и псевдопатриотизма, а есть только бремя памяти, скорби и правды...

Осмелюсь утверждать, что подобное бремя неподъемно не только для власти, но и для многих из нас, стремящихся, в лучшем случае, к неучастию во лжи, но бегущих, как черт ладана, участия в правде.

Бремя, в том числе буквальное, в виде бревен, которые Цитович возносил на венцы часовни, а теперь возносит на звонницу.

Часовни, на которую ушла вся премия "За духовное возрождение" (редкий случай совпадения смысла и дела).

Часовни, в стены которой вошла не только боль души, но и боль спины, надорванной еще на возведении ветряной мельницы в знаменитых "Дудутках"...

Даль определяет часовню как "маленькое строенье", которое ставится "в виде памятника, или на распутьях, на родниках...".

Пример Цитовичей — это пример жизни "на родниках". Жизни, в которой нет ни грамма мути и фальши, а есть участие в Правде, от которого сужается пространство для лжи.

kamerton_41@mail.ru

ПАЛІТКУХНЯ

Сацыял-дэмакратычная ракіроўка

На адбыўшымся ў мінулую нядзелю пазачарговым з'ездзе Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатоль Ляўковіч змяніў на пасадзе старшыні Аляксандра Казуліна.

Нагадаем, што спачатку гэты з'езд планавалася правесці як тэхнічны. На ім павінны былі толькі вылучыць ад партыі патэнцыяльных кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Аднак большасць дэлегатаў (а іх з'ехалася 76 з 86 абраных) запатрабавала ўключыць у парадак дня пытанне аб пераабранні партыйнага кіраўніцтва. На пасаду старшыні партыі спачатку вылучылі чатыры асобы. Аднак Алег Трусаў і Мечыслаў Грыб адмовіліся балатавацца. Таму прэтэндэнтаў засталося двое: старшыня партыі Аляксандр Казулін, які знаходзіцца за кратамі, і выканаўца абавязкаў старшыні партыі Анатоль Ляўковіч.

53 дэлегаты прагаласавалі за Ляўковіча, 22 — супраць. Такім чынам, Аляксандра Казуліна абвясцілі ганаровым старшынёй партыі і фактычна адсунулі ад кіраўніцтва.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Анатоль ЛЯЎКОВІЧ: «З'езд рэальна ацаніў ролю людзей у партыі»

Пасля з'езда яго рашэнне пракаментаваў новы старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатоль ЛЯЎКОВІЧ:

— Адразу хачу адзначыць, што камісіяй па падрыхтоўцы з'езда не ўносілася пытанне аб змене кіраўніцтва партыі. Гэтае пытанне паднялі дэлегаты з'езда. І шмат хто з іх спасылаўся на звароты самога Аляксандра Казуліна да ўсіх сяброў партыі. А такіх зваротаў было два, і Аляксандр Уладзіслававіч сам ставіў пытанне аб тым, каб на гэтым з'ездзе было зменена кіраўніцтва партыі. І ініцыятыва гэтая прагучала яшчэ да пахавання Ірыны Іванаўны. А пасля Аляксандр Казулін паўтарыў яе. Акрамя таго, Аляксандр Уладзіслававіч тады падняў і пытанне аб стварэнні ў партыі фракцыі. У той сваёй заяве каардынатарам фракцыі была прызначана старэйшая дачка Аляксандра Казуліна — Вольга. Пасля чаго, на маю думку, фракцыя і распачала партыйныя рознагалоссі. Зразумела, што многім гэта не падабалася — партыя павінна быць стабільнай, арганізаванай, павінна эканамічна развівацца... Вынікі галасавання вам вядомы. Па аб'ектыўных прычынах не прыехалі толькі 9 дэлегатаў, так што з'езд прайшоў вельмі арганізавана. І ўсе сышліся аднадушна — партыю трэба прывесці ў адэкватны стан. Што гэта значыць? У 2005 годзе я змяніў Мікалая Статкевіча на пасадзе старшыні партыі, і з таго часу займаўся ўсімі арганізацыйнымі і аператыўнымі пытаннямі. Калі ў партыю прыйшоў Аляксандр Уладзіслававіч, адразу пачалася прэзідэнцкая кампанія, і ў яго проста не было часу займацца партыяй. А пасля яго пасадзілі ў турму. Натуральна, што зараз адтуль ён не можа аператыўна арганізоўваць і ўпраўляць партыяй з-за таго, што не атрымлівае адэкватнай і дакладнай інфармацыі. Інфармацыя ішла праз Ігара Рынкевіча, праз каго-небудзь яшчэ... Але на прэзідыуме партыі з Рынкевіча знялі статус прадстаўніка Казуліна. Менавіта за тое, што той займаўся дэзінфармацыяй аб стане ў партыі. 28 лютага на месца Рынкевіча была прызначана Вольга Казуліна. Але з таго часу яна не прыехала ні ў адну арганізацыю, не пацікавілася, чым жыве партыя, ні разу не сустрэлася з кіраўніцтвам партыі... Хоць мы неаднойчы дамаўляліся аб сустрэчах. І гэта гаворыць пра тое, што Вольга Казуліна таксама не магла валодаць аб'ектыўнай інфармацыяй аб стане ў партыі, і, суадносна, не магла даваць такую Аляксандру Уладзіслававічу Казуліну. Таму з'езд рэальна ацаніў сітуацыю і ролю людзей у партыі.

А Аляксандра Казуліна мы абвясцілі ганаровым старшынёй і тым самым, на мой погляд, яшчэ вышэй паднялі яго статус у вачах грамадскасці Беларусі і замежжа. Таму што шмат партый і старшынь, а ганаровых — на пальцах пералічыць можна. Такім з'яўляецца, здаецца, толькі Станіслаў Багданкевіч у Аб'яднанай грамадзянскай партыі.

АЛЬТЭРНАТЫВА

Вольга КАЗУЛІНА: «З гэтага моманту палітычная кар'ера Ляўковіча пойдзе на спад»

Мы звярнуліся за каментарыем рашэння партыі і да Вольгі КАЗУЛІНАЙ.

— Спадар Ляўковіч дабіўся таго, чаго заўсёды хацеў — стаць старшынёй партыі, — кажа яна. — Але, як мне падаецца, яго палітычная кар'ера з гэтага моманту пойдзе на спад. Таму што з такімі людзьмі на міжнародным узроўні ніхто не будзе мець зносіны. Мала таго, што ён падставіў сябе, дык яшчэ і зняславіў усю партыю. Проста вельмі шкада тых людзей, якія рызыкуюць сваімі свабодамі, сем'ямі, работай... Якія ўступілі ў партыю і не пабаяліся гэтага. А іх узялі і падставілі.

— Ініцыятыва аб змене кіраўніцтва насамрэч сыходзіла ад Аляксандра Уладзіслававіча?

— Так, ён і праўда быў незадаволены кіраўніцтвам партыі. І некалі гэтыя пытанні трэба было вырашаць, бо іх назбіралася вельмі шмат. Пачаліся нават фальсіфікацыі дакументаў, і, натуральна, нікому гэта не падабалася. Але за дзень да з'езда я патэлефанавала спадару Ляўковічу і сказала, што мы не будзем ініцыяваць пытанне аб змене кіраўніцтва. Таму што зараз на парадку дня — парламенцкія выбары. Кампанія вельмі сур'ёзная, нервовая і небяспечная. Я прапанавала Анатолю Ляўковічу правесці з'езд мірна і ціха. Таму што ў нас ёсць іншыя мэты. На што было адказана: "Усё так і будзе". А на наступны дзень былі абліты брудам і Аляксандр Казулін, які знаходзіцца ў няволі, і я. Самае цікавае, што мяне ў якасці дэлегата з'езда не прызналі, хоць я з'яўляюся прамым прадстаўніком Аляксандра Уладзіслававіча.

— Анатоль Іосіфавіч сцвярджае, што вы не сустракаліся з прадстаўнікамі партыі, не валодалі аб'ектыўнай інфармацыяй...

— Давайце пачнём з таго, што я еджу па рэгіёнах — была ў Магілёве, Бабруйску... Але калі аднойчы на прэзідыуме я папрасіла, каб мяне ўключылі ў склад дэлегацыі, якая ездзіць і сустракаецца з людзьмі, то мне сказалі: "Дзяўчынка, а хто ты тут такая? Ты што, задумала нас кантраляваць? Ідзі туды, адкуль прыйшла". Вось вам адказ на тое, ці хацеў Ляўковіч, каб я прадстаўляла Казуліна. Хоць мяне зараз разоў у дзесяць больш, чым Ляўковіча, запрашаюць на сустрэчы і ў Еўропу, і ў Амерыку. Напэўна, гэта не ўсім падабалася.

— Тым не менш Аляксандр Казулін абраны ганаровым старшынёй партыі... Што ж за крыўды могуць быць?

— На мой погляд, зроблена гэта толькі для таго, каб карыстацца прозвішчам Казуліна. Думаю, што гэта не атрымаецца. Я паслала тату тэлеграму, дзе поўнасцю апісала з'езд. І, як мне падаецца, у хуткім часе чакайце ад Аляксандра Казуліна гучных заяў.

Алесь СІВЫ.

РЭЗАНАНС

Па-здрадніцку!

Група палітыкаў і грамадскіх дзеячаў Беларусі выступіла з заявай, у якой назвала рашэнне пазачарговага з'езда Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) амаральным.

Подпісы пад заявай паставілі **Мікалай Аўтуховіч, Дзмітрый Дашкевіч, Цімафей Дранчук, Дзмітрый Каспяровіч, Юрый Лявонаў, Міхаіл Марыніч, Мікалай Маркевіч, Павел Севярынец, Сяргей Скрабец, Мікалай Статкевіч і Артур Фіньковіч**. Усе гэтыя людзі — прадстаўнікі апазіцыі і былыя зняволеныя.

"Мы выказваем рашучы пратэст дзеянням Анатоля Ляўковіча і яго каманды, якія здрадніцкім чынам адлучылі ад кіравання партыяй палітзняволенага Аляксандра Казуліна і ўсіх яго калег, што яго падтрымлівалі і актыўна праводзілі кампанію "Свабоду Казуліну", — заявіў у інтэрв'ю БелаПАН адзін з ініцыятараў стварэння камітэта ў абарону правоў зняволеных "Над бар'ерам" Ц.Дранчук. Паводле яго слоў, *"тыя, хто падпісаўся, на практыцы ведаюць, наколькі маральна дапамагае падтрымка і як цяжка ўспрымаюцца здрадніцкія дзеянні калег па партыі"*.

"На наш погляд, найбольш верагодным тлумачэннем гэтых амаральных і здрадніцкіх дзеянняў з'яўляецца дамоўленасць каманды Ляўковіча з дыктатарскім рэжымам напярэдадні парламенцкіх выбараў, — лічыць Ц.Дранчук. — *Пры такіх акалічнасцях мы не выключаем, што Ляўковіч можа быць адным з прызначаных псеўдадэмакратаў у Палаце прадстаўнікоў"*.

Выказваючы салідарнасць і словы падтрымкі А.Казуліну, былыя зняволеныя палітыкі і грамадскія дзеячы заявілі пра адмову супрацоўнічаць з А.Ляўковічам і яго прыхільнікамі. У заяве таксама ўтрымліваецца заклік да прадстаўнікоў дэмакратычнага руху *"не прызнаваць старшынства Ляўковіча ў БСДП (Грамада)"*.

Игорь РЫНКЕВИЧ: Луна не затмит солнце, даже если у нее будут очень большие «уши»

Разные мнения звучат по поводу того, что произошло в партии. Произошедшее аналитики уже назвали и политической авантюрой, и предательством, при этом поневоле сравнивая масштабы личности Александра Козулина и его "сменщика". Зампредседателя БСДП Игорь Рынкевич, отказавшийся от постов в новом руководстве партии, сравнил партийных председателей с недавним солнечным затмением.

— Сейчас в Беларуси и за рубежом задаются вопросом "ху из Левкович", сравнивая последнего с профессором Козулиным. А соотносятся Левкович и Козулин, как Луна и Солнце: просто недалекий от нас спутник закрыл на мгновение находящегося вдали политического гиганта. Такое затмение, даже если у Луны будут очень большие "уши", — скоротечно, — считает Рынкевич. — Недавно А.Лукашенко заявил, что для получения представителем оппозиции мандата депутата парламента авторитарному правителю придется тому помогать, таща за уши. И сегодня многие особое внимание устремили на уши Левковича, полагая, что его действия против Козулина, напоминающие рвение новозаветного Иуды, "достойны" кресла депутата Палаты №4. Но такого вознаграждения не произойдет, история учит: при всей любви правителей к предательству в стане противников они при удобном случае избавлялись от единожды предавших.

В интервью сайту, представляющему интересы коммунистов во главе с Сергеем Калякиным, Левкович и вовсе довел ситуацию до фарса: он провозгласил свое председательство "реальным руководством" Грамады и началом участия партии в очередной "президентской кампании". И хотя в действительности это становится началом политической агонии грамадовской верхушки, в оппозиционной среде повис вопрос: кому, кроме властей, понадобилось свержение Александра Козулина?!

И.Рынкевич, который в соответствии с решением Конгресса ОДС, по-прежнему является членом руководящих структур ОДС, полагает, что *"очень скоро по реакции руководителей оппозиции действительное положение Александра Козулина и его "тени" выявится совершенно отчетливо"*.

По его мнению, всем морально здоровым силам в партии нельзя поддаться стремлению покинуть Грамаду, важно сплотиться в отстаивании социал-демократических принципов и идей Александра Козулина. "Мы будем противостоять ползучему большевизму. В ранее созданную фракцию БСДП *"За внутрипартийную демократию" обращаются десятки грамадовцев, в том числе и те, кто раскаялся в принятом на съезде вероломном решении. Время левковичей-грибов проходит, а звезда Козулина восходит в свой зенит"*, — заявил Игорь Рынкевич.

«Не дожить до разочарования в тех, кого ты считал друзьями, — это тоже своего рода подарок судьбы»

Когда-то, когда Козулина только-только посадили, мы встретились с Ириной Козулиной в Вильнюсе. Там как раз была сумасшедшая тусовка с участием президентов Польши и Литвы, Хавьера Соланы; ожидался и Виктор Ющенко. И я сказал тогда Ирине Ивановне:

— Белорусская социал-демократия — это всего лишь идейное обоснование политического каннибализма. Эта партия пожирает всех своих лидеров, которые убеждены, что ее контролируют. Съели Карпенко и Трусова, затем съели Сечко, затем — Статкевича, который и вовсе был убежден, что это он их всех ест, а не они его. Имейте в виду, когда источники финансирования закончатся, ближайшие соратники с радостью продадут структуру новой жертве. Чтобы сначала съесть ее деньги, а потом и ее самое.

Ирина Ивановна тогда мне сказала, что эти милые люди так верны Александру Владиславовичу, так разделяют ее горе, так много ей помогают в борьбе за его освобождение...

Иногда я думаю, что не дожить до разочарования в тех, кого ты считал друзьями, — это тоже своего рода подарок судьбы.

Александр ФЕДУТА.

АД РЭДАКЦЫІ

Чакаем

Але ўжо відавочна, што абодва бакі маханулі шашкамі і нічога добрага з гэтага не атрымалася. Спадарыні Вользе сапраўды, напэўна, трэба было больш працаваць з сябрамі партыі. Візіты ў Еўропу і ЗША — патрэбная рэч, але лёс партыі, лёс краіны вырашаецца тут, у Беларусі. А спадару Ляўковічу неабходна задумацца, ці сапраўды ўсё так добра, калі ў партыі адбываецца скандал за скандалам. І каго БСДП будзе вылучаць кандыдатам у прэзідэнты — А.Казуліна ці...?

SVERIGES AMBASSAD

Пасольства Швецыі Рэспубліка Беларусь

Шведскае пасольства ў Мінску шукае супрацоўнікаў

Швецыя адкрывае сваё пасольства ў Беларусі і ўвосень мае намер распачаць падбор мясцовага персаналу. Адкрыццё пасольства запланавана на зіму, таму непасрэдна набор супрацоўнікаў будзе ажыццяўляцца ў канцы 2008 — пачатку 2009 г.

Больш інфармацыі пра ўмовы і працэдуру пошуку супрацоўнікаў можна атрымаць на хатняй старонцы Аддзялення пасольства Швецыі ў Мінску — **www.sweden.by**

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЖНІЎНЯ 2008 г.

ПАРТРЭТНАЯ ГАЛЕРЭЯ

Дзяніс САДОЎСКІ:

«Трэба вярнуць людзям веру ў перамены»

За апошні год Дзяніс Садоўскі, адказны сакратар аргкамітэта па стварэнні партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя", арганізаваў і быў удзельнікам шэрагу сацыяльных кампаній. На ягоную думку, прыйшоў час узяць удзел і ў кампаніі па выбарах у Палату прадстаўнікоў. Садоўскі збіраецца балатавацца ў парламент і лічыць, што яму ёсць што сказаць суграмадзянам.

— Дзяніс, чаму ўсё ж вы вырашылі ўключыцца ў гэту выбарчую кампанію?

— Асноўная мэта майго ўдзелу ў выбарах — гэта перамога ў сэрцах людзей. Гэта тое, да чаго я імкнуся, і тое, чаго я буду дабівацца разам са сваёй камандай. З хрысціянамі, якія мяне падтрымліваюць, а таксама з людзьмі, якія проста неабыякавыя да краіны, да хрысціянскіх, да кансерватыўных каштоўнасцяў. Галоўная задача, якую я бачу перад сабой, — вярнуць людзям веру ў перамены. Гэта значыць, што перамен можна дасягнуць, што паказваюць і нашы паспяховыя кампаніі.

— А якія кампаніі вы лічыце ўдалымі?

— Зусім нядаўна, прыкладам, актывісты, якія ўваходзяць у аргкамітэт па стварэнні БХД, праводзілі кампанію па забароне рэкламы экстрасэнсаў, астролагаў і майстраў таро ў СМІ. І гэта прынесла вынікі! Так, у чэрвені гэтага года парламент унёс у закон дапаўненне, якім забараняецца рэклама акультных паслуг. Кіраваў кампаніяй менавіта я — і лічу гэты поспех доказам таго, што і ў цяперашніх умовах грамадскасць здольная нешта змяніць у дзяржаве.

Ну і нельга не ўспомніць кампанію па зборы подпісаў аб змяненні рэлігійнага заканадаўства. Цэрквы сабралі больш за 50.000 подпісаў, што таксама для нашых умоў вельмі і вельмі няблага. І гэта подпісы, якія не прапалі і не прападуць, гэта подпісы, якія будуць перш за ўсё выкарыстаныя, калі сітуацыя зменіцца. І я веру, што адным з першых законаў будзе зменены закон аб свабодзе сумлення.

— Што, на ваш погляд, тады замінае адбыцца пераменам у грамадстве?

— Нельга мірыцца з хлуснёй. Яна ёсць паўсюль, большасць людзей бачыць, што адбываецца навокал, але яны маўчаць. Я хацеў бы давесці людзям, што маўчанне — гэта горш, чым дзейнае зло. Бо, як сказаў адзін сапраўды разумны чалавек, для таго, каб зло прагрэсіравала, дастаткова, каб добрыя людзі проста нічога не рабілі. А гэта якраз тое, што цягам некалькіх гадоў адбываецца ў нашай краіне. Добрыя людзі альбо працуюць не так як след, альбо зусім маўчаць, а зло працягвае свае дзеянні. Я веру ў тое, што калі добрыя людзі аб'яднаюцца, то сітуацыю можна змяніць. Людзі, якія ведаюць, чаго яны хочуць, ведаюць, што адбываецца ў нашай краіне.

За тое, што адбываецца зараз у нашай краіне, адказны кожны з нас. Адказны і я ў тым ліку, бо, магчыма, не зрабіў цалкам тое, што павінен быў зрабіць. Не працаваў так эфектыўна, як павінен быў працаваць. Адказны кожны з нас, нельга так казаць, што вось адказны ён, адказны прэзідэнт, адказны міністр, адказны чыноўнік — адказны кожны за тое, што маем. Таму мы павінны перагледзець усё, што мы рабілі дагэтуль, і пачаць працаваць сапраўды не напаказ, а на змену сітуацыі ў краіне. Трэба паказаць людзям, што яны могуць дасягнуць перамен, але пры гэтым падкрэслю, што без веры ў Госпада гэтых змен дасягнуць немагчыма.

Кожны чалавек, які верыць у Госпада, гэта ёсць агеньчык, які асвятляе цемру вакол сябе. Але па адным гэтыя агеньчыкі не маюць поўнай сілы, якая ёсць у паўнавартаснага агню. Таму я бачу мэту сваёй кампаніі — аб'яднаць асобныя агеньчыкі і запаліць моцны агонь тых людзей, якія вераць у Госпада, вераць у перамены для нашай краіны. Як гаворыцца ў Святым Пісанні: "Вы ёсць святло для гэтага свету". Хочацца, каб мы той агонь веры распаўсюдзілі на іншых людзей, з якімі будзем размаўляць. Агонь веры ў тое, што ўсё небезнадзейна ў Беларусі. Наша пасланне ідзе да сэрцаў людзей. Зноў жа ў Святой кнізе гаворыцца, што адзін чалавек, які верыць у Госпада, зможа перамагчы тысячу, а двое — змогуць перамагчы цемру. У нашай краіне сапраўды цемра, якую мы зможам перамагчы толькі разам. Я веру, што пасля гэтага мы зможам прынесці нашай краіне сапраўдныя хрысціянскія стандарты, і Беларусь стане заможнай і незалежнай. Мы бачым новую Беларусь як дэмакратычную краіну, якая стаіць на хрысціянскім кансерватыўным падмурку.

— Не баіцеся "абвінавачанняў" у залішняй маладосці для дэпутацтва?

— Так, шмат хто кажа: "Дзяніс, куды ты ідзеш? Табе толькі 25 год — ці не зарана ты пачаў?" Я веру, што маладосць — гэта не грэх, гэта не загана. Маладосць — гэта перавага, якую мае чалавек. Бо ён актыўны, бо ён яшчэ верыць у тое, што ён робіць, у тое, што ягоныя дзеянні — небезнадзейныя. Тое, што я пайшоў на выбары, ёсць сапраўды жаданне майго сэрца данесці да людзей агеньчык веры, надзею на тое, што сітуацыя ў краіне зменіцца толькі тады, калі мы разам пачнем яе мяняць.

— Як стасуюцца мэты актывіста БХД з пасланнем АДС да выбаршчыкаў?

— Асабіста я б дадаў да паслання АДС ці нават бы крыху перайначыў бы вось што: кантроль над уладай, мне здаецца, гаворыць пра тое, што мы не можам стаць самі ўладай, а будзем толькі спрабаваць яе кантраляваць нейкім чынам. Мне здаецца, гэта трошкі не той пасыл, якім ён павінны быць. Але, канешне, я буду выкарыстоўваць пасланне АДС у сваёй кампаніі.

— Што можаце сказаць пра сваю акругу?

— Праца з людзьмі, лічу, была праведзена неблагая. Мы арганізавалі сацыяльныя кампаніі ў сваёй 103-й Масюкоўшчынскай акрузе, сацапытанні, распаўсюджвалі інфармацыю наконт будучых выбараў, наконт хрысціянскай дэмакратыі. Вось, напрыклад, кампанія "Святлафор" дазволіла нам даволі шмат даведацца пра настроі людзей. Жыхарам раёна неадкладна патрабуецца святлафор альбо падземны пераход на дарозе з інтэнсіўным рухам, якая ідзе праз Кунцаўшчыну са Ждановіч. Шмат хто казаў нам, што там нават гінулі людзі. Мы збіралі подпісы — і людзі падыходзілі літаральна натоўпам, нават прыемна было збіраць. За дзве гадзіны мы сабралі 167 подпісаў, больш таго, людзі прасілі нас пачакаць, каб яны паспелі прывесці сваіх сваякоў, каб тыя таксама падпісаліся. І прыводзілі! Гэта паказала, што менавіта хвалюе людзей на месцах. Вось за гэта яны гатовы змагацца, хаця б пакуль і подпісамі сваімі. Не ўсё безнадзейна ў нашым грамадстве! Дарэчы, зараз выбаршчыкам будзе зусім проста ажыццяўляць зваротную сувязь са мной як з кандыдатам у дэпутаты — у сеціве запрацаваў мой спецыяльны сайт http://ds.bchd.info/.

Гутарыў Пётр КУХТА.

ДАВЕДКА

Дзяніс Садоўскі нарадзіўся 11 чэрвеня 1983 года ў Мінску. Хрысціянін.

Жанаты. У 2002 годзе скончыў Мінскі машынабудаўнічы каледж па спецыяльнасці "эканаміст-маркетолаг", у 2006-м — Мінскі інстытут кіравання па спецыяльнасці "эканаміст". Працуе начальнікам упраўлення развіцця міжнароднага супрацоўніцтва ТАА КК "Беларусь Капітал Менеджмент" (Масква). Сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў.

Арганізатар Кампаніі барацьбы з акультызмам (снежань 2007 года — май 2008 года), адзін з каардынатараў Кампаніі ў абарону права на свабоду сумлення (сакавік 2007-га — май 2008-га). Адзін з арганізатараў кампаніі "Пакаянне" (2007г.), прымеркаванай да 70-й гадавіны піка сталінскіх рэпрэсій і ўшанаванні памяці ахвяр масавых рэпрэсій. Арганізатар шэрагу мясцовых кампаній у Фрунзенскім раёне па добраўпарадкаванні раёна і паляпшэнні ўмоў жыцця.

Досвед працы ў выбарчых кампаніях:

— актыўны сябра штаба А.Мілінкевіча ў прэзідэнцкай кампаніі 2006 года;

— кандыдат у мясцовы савет дэпутатаў на выбарах 2007 года.

Захапленні: здаровы лад жыцця, футбол, рыбалка.

Спадар Арэнс ужо ведае, як праходзяць беларускія выбары

Місію АБСЕ, якая будзе назіраць за беларускімі парламенцкімі выбарамі, узначаліў нямецкі дыпламат Ганс-Генрых Арэнс.

Для Беларусі гэта ўжо не новая персона. Менавіта Арэнс узначальваў місію АБСЕ, якая працавала ў Беларусі падчас мінулых прэзідэнцкіх выбараў.

Тым часам у Беларусь ужо прыехалі першыя тры прадстаўнікі місіі назіральнікаў АБСЕ на парламенцкіх выбарах. За некалькі дзён да выбараў запланаваны прыезд кароткатэрміновых назіральнікаў. Гэтая група будзе самай шматлікай — каля 300 чалавек.

На гэтых выбарах упершыню будуць галасаваць арыштаваныя

Выбаршчыкі, якія адбываюць пакаранне ў выглядзе арышту, маюць права галасаваць на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў.

Такое тлумачэнне дала Цэнтральная выбарчая камісія на пасяджэнні ў Мінску.

У адпаведнасці з рашэннем ЦВК грамадзяне, што адбываюць пакаранне ў выглядзе арышту ў арыштанцкіх дамах, следчых ізалятарах і турмах, галасуюць па месцы знаходжання. Кіраўнікі адпаведных устаноў падаюць спісы ў акруговыя выбарчыя камісіі не пазней 12 верасня.

Бюлетэнь для галасавання выдаецца пры прад'яўленні пашпарта, а ў выпадку яго адсутнасці — пры прад'яўленні асабістай справы.

Па дадзеных ЦВК, на даны момант пакаранне ў выглядзе арышту ў Беларусі адбываюць крыху болей за тысячу чалавек.

Самакрытыка

Баранавіцкая незалежная газета "Intex-press" 31 ліпеня надрукавала інтэрв'ю карэспандэнта газеты Руслана Гарбачова з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу другога і трэцяга скліканняў Мікалаем Сергіенкам, які вельмі крытычна ацаніў сваю дзейнасць і дзейнасць усіх цяперашніх дэпутатаў. На пытанне карэспандэнта, як ён ацэньвае вынікі васьмігадовай працы ў парламенце, Мікалай Сергіенка адказаў:

— Калі ацэньваць па 10-бальнай сістэме, я б сабе паставіў адзнаку 4. Адзнак 7—10 я не паставіў бы нікому, пяці дэпутатам паставіў бы "шасцёркі". Большасці парламентарыяў трэба ставіць 4—5. Сваю работу, як і работу іншых дэпутатаў, я ў першую чаргу ацэньваю па яе эфектыўнасці. Шмат працаваць — гэта не заўсёды добра працаваць.

Паважаная "Народная воля"! Вы мала пішаце пра пазіцыю тых, хто прытрымліваецца ідэі байкоту выбараў. Між тым, наколькі я ведаю, у грамадстве такія настроі вельмі моцныя — наўпрост не хадзіць ні на якія выбары, бо ўсё роўна падмануць. Калі казаць пра маю асабістую пазіцыю, то я яшчэ не вызначыўся. Дапамажыце мне, прадстаўце на сваіх старонках розныя пункты гледжання.

Міхась НАВІЦКІ, Магілёў.

Выконваем просьбу нашага чытача. Тым больш што тых, хто адмаўляецца ад удзелу ў выбарах, становіцца ўсё больш.

Байкот — хлусні!

Прадстаўніца Партыі БНФ Святлана ЛАПІЦКАЯ з Жодзіна дэманстратыўна адмовілася ад удзелу ў выбарах прама ў памяшканні акруговай выбарчай камісіі. Прапануем вам тэкст яе адкрытага звароту.

"24.07.2008 г. у памяшканні Жодзінскай акруговай выбарчай камісіі №66 я, прадстаўніца ПБНФ Святлана Лапіцкая, афіцыйна абвясціла пра сваю адмову ўдзельнічаць у так званых выбарах дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання, якія плануецца правесці восенню 2008 года, і дэманстратыўна адмовілася рэгістраваць сваю ініцыятыўную групу.

Гэты мой крок прадыктаваны тым, што для рэальных перамен у бок дэмакратызацыі выбарчага працэсу, акрамя палітычных заяў кіраўніцтва РБ, нічога не зроблена. Як і раней, сфарміраваны надзейныя механізмы для маніпуляцый галасамі выбаршчыкаў, імі кіруюць тыя ж самыя асобы, што працавалі на "план" ва ўсіх мінулых "выбарчых спектаклях"...

Назіраемыя разыходжанні ў афіцыйнай рыторыцы і практычных захадах падчас прасоўвання выбарчага працэсу, неўключэнне ў склад акруговых выбарчых камісій па ўсёй краіне такіх аўтарытэтных і дасведчаных асоб, як Станіслаў Шушкевіч, Валянцін Голубеў, Пятро Казлоўскі, Аляксандр Сасноў, у тым ліку ў Жодзіне — Аляксей Лапіцкі (праваабаронца, сябра Сойму ПБНФ) — сведчыць толькі пра адно: выбараў і на гэты раз не будзе.

Улады, нягледзячы на афіцыйныя заявы, працягваюць зневажаць свой народ... А садзейнічаць падобнаму падману сваім удзелам у чарговым выбарчым фарсе, як чалавек сумленны і адказны, я — адмаўляюся.

Заклікаю ўсіх тых, хто не згубіў пачуццё ўласнай годнасці, выказаць свой недавер кіраўніцтву ЦВК, цяперашняму рэжыму... і не хадзіць на выбарчыя ўчасткі, не ўдзельнічаць у падложным спектаклі, сканцэнтраваць свае намаганні на адстойванні права на рэальны, свабодны і дэмакратычны выбарчы працэс, на свабодныя і дэмакратычныя выбары ў Беларусі.

Я, Святлана Лапіцкая, сябра ПБНФ, праваабаронца і грамадзянская актывістка, удзельніца выбарчых кампаній 2001, 2003, 2004 і 2006 гг. — здымаю сваю кандыдатуру не на карысць нейкага іншага прадстаўніка ў будучым "палітычна-наменклатурным фарсе" . Гэта было б абсурдным яшчэ і таму, што ўсе вылучаемыя кандыдатуры з Жодзіна і Смалявіч сёлета не выклікаюць даверу як сапраўды самастойныя і незалежныя палітычныя фігуры. Годная дэмакратычная альтэрнатыва не можа з'явіцца, пакуль выбары не стануць рэальнымі, пакуль мы не навучым уладу паважаць кожнага з нас, нашы правы і свабоды, свой народ.

Паставіць на месца "зарваўшагася чыноўніка" можна толькі сілай грамадзянскага супраціву — унутранай чысціні і несакрушальнай веры ў абавязковую перамогу праўды, права і нацыянальнай еднасці... Толькі шырокі грамадскі байкот плануемага ў нашай краіне чарговага здзеку з выбарчага і грамадзянскага права можа спыніць далейшае паглыбленне краіны ў бездань падману, дыктату і здрады. Толькі так можна прымусіць чынавенства ўзгадаць пра сапраўдную адказнасць перад ўласнымі выбаршчыкамі, перад кожным з нас і беларускім народам. Трэба дакладна разумець, што Беларускі народ — гэта не "група аднадумцаў", народ не можа быць "партыяй" ці нейкім прыдаткам да "партыі ўлады", як сёння гэта спрабуе прыпаднесці афіцыйная прапаганда. У Канстытуцыі Беларусі ёсць наўпрост забарона на падобны ідэалагічны манапалізм дзяржавы і, як след, абавязковасць падобнага "народнага аднадумства".

Наш народ — не аморфная шэрая маса клонаў альбо марыянетак, не "ідэалагічная прыслуга" ля "трона" ўлады. Наш народ — таленавіты, моцны і непераможны. Ён — разнастайны, талерантны і салідарны. І не трэба "апранаць" яго ў "брудную вопратку ката", узбройваць "сякерай аднадумства і правільнасці", скіроўваць супраць надуманых ворагаў — "іншадумцаў"! Наша моц — у салідарным адзінстве — адзінстве ЗА ПРАЎДУ, ГОДНАСЦЬ І ЗА СВАБОДУ! У тым ліку — СВАБОДУ ДУМКІ І СЛОВА! Адзінымі мы можам быць толькі ў сваім салідарным імкненні быць свабоднымі, годнымі і заможнымі — жыць у адзінай, свабоднай, мірнай і дэмакратычнай Беларусі.

Усё іншае — ад Лукавага. Гэта — працяг шляху да бясконцага, злачыннага расколу грамадства. Але ў нас не павінна быць падзелу на "народ" і "ўсіх астатніх", на "правільных" і "апазіцыйных" грамадзян (апошнія — беларусы — ужо зараз быццам эмігранты ва ўласнай краіне...). Таму ў нас няма большага ворага ў краіне, чым падобная "ўсеагульнанародная афіцыйная правільнасць" — яна ёсць пачатак і працяг неправамернай практыкі "пераследу за іншадумства"...

Адзінымі мы можам быць толькі ў свабоднай, незалежнай і дэмакратычнай Беларусі, якая памятае, адэкватна ўспрымае і разумее як урокі гісторыі, так і сучаснасць, ідзе ў нагу з часам, прырастае сябрамі, а не стварае новых і новых ворагаў ...

Таму я заклікаю да супраціву цяперашняму цынізму і нахабству, з якімі, на мой погляд, улады рыхтуюцца ў чарговы раз падманыць і яшчэ больш раз'яднаць беларускае грамадства. Я заклікаю да супраціву падлогу і здрадзе, з якімі ў Беларусь насоўваецца кланава-алігархічны падзел маёмасці на новай стадыі — "правільнай беларускай прыхватызацыі"...

Як без права свабоднага выбару можна заставацца гаспадаром на сваёй уласнай зямлі, быць сапраўдным грамадзянінам ва ўласнай дзяржаве?

Байкот не выбараў, але выбарчага фарсу патрэбен як рашучы аргумент супраціву — для дасягнення змен у афіцыйных трактоўках палажэнняў Выбарчага кодэксу РБ, для прыняцця дакладна прапісанай дэмакратычнай працэдуры па фарміраванні збалансаваных па складзе, самастойных выбарчых камісій, для правядзення ўсіх этапаў выбарчага працэсу пад пільным прававым кантролем грамадства. Беларусі, як паветра, сёння патрэбныя рэальная свабода СМІ, свабода слова і думкі, мірных мітынгаў і сходаў, асацыяцый, свабода выбару, без якіх немагчыма ратацыя на любых узроўнях улады, грамадзянская актыўнасць і зваротная сувязь з выбаршчыкамі, сапраўдны НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ за чынавенствам, рост прававой культуры і адказнасці, упэўненасці ў дзейснай сіле права...

Прадстаўнік Жодзінскага рэгіёна ў парламенце (як і іншых рэгіёнаў Беларусі) павінен быць прынцыповым і смелым чалавекам, актыўным абаронцам нашых грамадзянскіх правоў і свабод, а не кантралюемай пешкай у руках ідэалагічных аддзелаў і наменклатурнай аўтакратыі. Любога рангу чыноўнік ва ўладзе абавязаны жыць па дзейсных у краіне законах. Спецслужбы павінны служыць дзяржаве і народу, быць падсправаздачнымі і кантралявацца грамадствам, якое мусіць пазбавіцца страху, палітычнага пераследу і дыктату...

Я цалкам падзяляю думку тых палітыкаў і праваабаронцаў, якія ўпэўнены ў тым, што кожны, хто сваім удзелам падтрымае будучы "выбарчы фарс" у Беларусі, так ці інакш будзе вымушаны гуляць па правілах дзейснага рэжыму. А апошні сёння проста спрабуе купіць міравую супольнасць за некалькі верагодных "незалежнікаў" у парламенце, якіх "толькі ён" можа "працягнуць" туды і "толькі за вушы"...

Але выйграць СВАБОДУ, выйграць ПАВАГУ ДА СЯБЕ, давер у сваіх дзяцей, выйграць БУДУЧУЮ, САПРАЎДУ СВАБОДНУЮ І МОЦНУЮ СВАІМ АДЗІНСТВАМ БЕЛАРУСЬ нельга, гуляючы па правілах ЦЫНІЗМУ, ХЛУСНІ І ЗДРАДЫ...

Нам патрэбны сапраўдныя выбары!

БАЙКОТ — ПАДМАНУ І ЗДРАДЗЕ!

МЫ — БЕЛАРУСЫ! І МЫ — ЛІЦВІНЫ!

МЫ — СПАДКАЕМЦЫ НАШАЙ ВЯЛІКАЙ І ВОЛЬНАЙ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ! БУДЗЬМА РАЗАМ І — ПЕРАМОЖАМ!

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!"

АКЦЕНТЫ

«Серые кардиналы» окружных комиссий

Мне попалась в руки газета "Минский курьер", в которой опубликован персональный состав окружных избирательных комиссий, образованных в столице. Просмотрела, и сразу возник вопрос: а почему в каждой комиссии есть представитель местной власти? Это что, обязательное условие нашего законодательства? Таким образом власть назначает надзирающих за "правильным" подсчетом голосов? И вообще, кто эти люди?

Ирина Васюкевич.
г.Минск.

Вопрос читательницы мы адресовали представителю юридической комиссии Объединенных демократических сил **Сергею Альферу**.

— Нет, присутствие в каждой комиссии представителя местного органа власти — это не обязательное условие. Но реально получается, что действительно во всех комиссиях оказывается представитель вертикали.

В Избирательном кодексе предусмотрено, что субъекты, которые формируют избирательные комиссии, могут выдвигать в их состав своих представителей. Так и получилось, что во всех окружных комиссиях есть представители как Мингорисполкома, так и президиума Минского городского Совета депутатов. Хотя поначалу власти планировали ограничиться одним представителем, но потом и это посчитали недостаточным.

Безусловно, сделано это для того, чтобы комиссии были подконтрольны.

Представители вертикали — это в основном либо сотрудники идеологических отделов, либо представители орготделов, в общем, сотрудники исполкомов. Они, как правило, занимают пост заместителя председателя комиссии и являются теми самыми "серыми кардиналами", которые контролируют выборы.

Мы решили выборочно проверить, кто же они, представители местной власти?

Шабановский избирательный округ №91 — **Барановская Людмила Николаевна**, заместитель главы Администрации Заводского района.

Автозаводской избирательный округ №92 — **Рудько Владимир Максимович**, первый заместитель главы Администрации Заводского района.

Васнецовский избирательный округ №93 — **Керножицкий Валентин Валентинович**, управляющий делами Администрации Заводского района.

Свислочский избирательный округ №94 — **Жмайлик Татьяна Николаевна**, начальник отдела предпринимательства и регистрации Администрации Ленинского района.

Купаловский избирательный округ №95 — **Пискунов Павел Васильевич**, начальник отдела организационно-кадровой работы Администрации Ленинского района.

Чкаловский избирательный округ №96 — **Баранов Юрий Васильевич**, начальник отдела организационно-кадровой работы Администрации Октябрьского района.

Грушевский избирательный округ №98 — **Кудермаев Александр Николаевич**, начальник отдела организационно-кадровой работы.

Юго-Западный избирательный округ №99 — **Черехович Наталья Федоровна**, начальник юридического отдела Администрации Московского района.

Есенинский избирательный округ №100 — **Коваленко Галина Федоровна**, начальник отдела идеологической работы Администрации Московского района.

Одинцовский избирательный округ №101 — **Царан Артем Николаевич**, начальник отдела организационно-кадровой работы Администрации Фрунзенского района.

Сухоревский избирательный округ №102 — **Козел Георгий Владимирович**, заместитель главы Администрации Фрунзенского района.

Кальварийский избирательный округ №104 — **Мисевец Виталий Григорьевич**, начальник отдела идеологической работы Администрации Фрунзенского района.

Старовиленский избирательный округ №105 — **Харута Тамара Михайловна**, начальник управления организационно-кадровой работы Администрации Центрального района.

Коласовский избирательный округ №106 — **Канапацкая Галина Евгеньевна**, начальник отдела организационно-кадровой работы Администрации Советского района.

Восточный избирательный округ №107 — **Кислицкая Татьяна Сергеевна**, начальник отдела по работе с обращениями граждан Администрации Советского района.

Калиновский избирательный округ №108 — **Богдан Вера Андреевна**, заместитель главы Администрации Первомайского района.

Уручский избирательный округ №109 — **Яльчик Константин Терентьевич**, первый зам. главы Администрации Первомайского района.

Партизанский избирательный округ №110 — **Старостина Людмила Ивановна**, отдел организационно-кадровой работы Администрации Партизанского района.

В Минске обнаружились, впрочем, два округа, где в составе окружных комиссий формально представителей Мингорисполкома нет. Так, по Октябрьскому избирательному округу от Минского городского совета депутатов в состав комиссии включен заместитель главы Администрации Октябрьского района **Владимир Иванович Македон**, а по Масюковщинскому избирательному округу №103 депутат по Фрунзенскому району **Юрий Микицкий**.

Таким образом, под контролем представителей вертикали находятся все комиссии.

АФІЦЫЙНА

Вызначаны парадак выступлення кандыдатаў у дэпутаты ў дзяржаўных СМІ

Цэнтрвыбаркам прыняў пастанову аб парадку выступлення кандыдатаў у дэпутаты ў дзяржаўных СМІ.

Як паведаміў сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай Лазавік, кандыдат у дэпутаты мае права апублікаваць сваю перадвыбарную праграму ў адной з наступных газет: "Звязда", "Народная газета", "Рэспубліка", "Белорусская нива". Акрамя таго, замест гэтых выданняў праграма можа быць апублікавана ў абласной або раённай газеце, якія выходзяць на тэрыторыі выбарчай акругі кандыдата. Па аб'ёме публікацыя не павінна перавышаць 4 тыс. знакаў з прабеламі. Тэкст перадвыбарнай праграмы неабходна падаць у рэдакцыю не пазней за 7 верасня.

Кандыдатам у дэпутаты таксама даецца права выступіць на радыё і тэлебачанні. Кандыдатам, зарэгістраваным у акругах Мінска і Мінскай вобласці, эфірны час будзе даваць радыёстанцыя "Сталіца", астатнім — абласныя радыёкампаніі.

Тэлевізійныя выступленні кандыдатаў з Мінска будзе трансляваць тэлеканал "Лад", кандыдатаў з Мінскай вобласці — тэлеканал СТВ, астатніх кандыдатаў — абласныя тэлерадыёкампаніі.

Выступленні па радыё і тэлебачанні будуць транслявацца ў запісе: па радыё — з 18 да 19 гадзін, па тэлебачанні — з 17.30 да 18.30. Выступленне аднаго кандыдата не павінна перавышаць 5 хвілін.

Тэлерадыёкампаніі абавязаны не толькі зрабіць запіс і трансляцыю перадвыбарных выступленняў кандыдатаў, але і інфармаваць гледачоў і слухачоў аб іх загадзя з указаннем нумароў акруг.

Сяргей КАРАЛЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЖНІЎНЯ 2008 г.

СОЦИУМ

Реакция людей на реальную жизнь,

или Что отражает зеркало общественного мнения?

Говорят, человек живет ожиданием завтрашней радости. В обратном случае он может впасть в депрессию и не видеть смысла в дальнейшем своем существовании. Как в этом плане обстоят дела в нашей стране? Каким образом социально-экономические реалии отражаются на настроении, самочувствии, материальном благосостоянии граждан, в конце концов? Ответы на эти вопросы в определенном смысле дают проводимые в Беларуси мониторинги изучения общественного мнения. Один из такого рода мониторингов в июне провел Независимый институт социально-экономических и политических исследований (НИСЭПИ). Прокомментировать полученные результаты обозреватель "Народной воли" попросил политолога **Сергея НИКОЛЮКА**.

— Сергей Александрович, так что отражает зеркало общественного мнения по поводу материального положения населения, его уверенности, как говорится, в завтрашнем дне?

— Когда в 2007 году наступил кризис в белорусско-российских отношениях, пик которого пришелся на январь, связанный с резким повышением цен на энергоресурсы, белорусское общество сразу на это должным образом прореагировало.

Таблица 1. Динамика ответов на вопрос "Как изменилось ваше личное материальное положение за последние три месяца?", %

Вариант ответа	06'06	01'07	05'07	09'07	12'07	03'08	06'08
Улучшилось	23.4	21.3	14.6	16.6	10.8	15.7	15.6
Не изменилось	63.0	61.0	66.3	67.1	55.3	57.6	62.2
Ухудшилось	11.1	16.8	17.7	15.6	32.4	25.0	21.8

Таблица 2. Динамика ответов на вопрос "Как изменится социально-экономическая ситуация в Беларуси в ближайшие годы?", %

Вариант ответа	03'05	06'06	01'07	05'07	09'07	12'07	03'08	06'08
Улучшится	29.7	46.0	25.6	22.8	22.5	23.2	29.8	31.4
Ухудшится	16.8	11.0	**30.6**	26.7	29.3	28.5	26.0	21.8
Не изменится	40.8	35.8	35.0	42.2	40.6	37.6	37.1	40.9

Настроение людей ухудшилось, их взгляды на будущее наполнились чувством пессимизма. Однако затем, вплоть до конца года, настроение граждан стало меняться к лучшему, хотя к уровню июня 2006-го оно так и не вернулось. А в конце 2007-го, когда резко выросли цены, в первую очередь на продукты питания, население весьма негативно отнеслось к происшедшему. Но уже с начала текущего года тенденция ухудшения самочувствия общества пошла на убыль, хотя цены продолжали расти. На мой взгляд, произошло обычное явление — адаптация (привыкание) людей к новым жизненным реалиям.

— Что бы вы могли сказать о нынешней социально-экономической ситуации в стране и что еще высвечивают результаты последнего, июньского соцопроса?

— Безусловно, власть, видя недовольство населения и осознавая последствия, пытается решать экономические проблемы. Но, на мой взгляд, улучшение материального благосостояния простых граждан необходимо в первую очередь для выживания самой власти. Природа поддержки власти за последние годы сильно изменилась. От былой харизмы главы государства практически ничего не осталось. Большинство жителей Беларуси смотрят сегодня на власть как на основной источник роста своего материального благополучия. Поэтому рейтинг Лукашенко напрямую зависит от роста реальной заработной платы и пенсий.

Таблица 3. Динамика ответов на вопрос "На ваш взгляд, в целом положение вещей в нашей стране развивается в правильном направлении или в неправильном?", %

Вариант ответа	06'06	01'07	05'07	09'07	12'07	03'08	06'08
В правильном	56.9	55.7	57.8	50.2	41.2	50.2	48.3
В неправильном	31.0	29.0	30.0	34.2	39.3	34.5	37.5

Таблица 4. Динамика ответов на вопрос "Если бы завтра состоялись выборы президента Беларуси, за кого бы вы проголосовали?", % (открытый вопрос)

Вариант ответа	04'06	08'06	11'06	01'07	05'07	09'07	12'07	03'08	06'08
За А. Лукашенко	60.3	54.9	49.7	50.9	48.0	44.9	39.9	42.5	38.9

— Способна ли власть вообще, с вашей точки зрения, решать стоящие перед Беларусью задачи?

— Не способна в принципе. В Беларуси индустриализация давно завершилась, а постиндустриальное развитие возможно лишь при условии равноправного союза между государством, бизнесом и обществом. Только союз трех этих сил, ставших экономическими и политическими субъектами, может обеспечить современное развитие. В Беларуси этого альянса нет. Главным же лицом, ответственным за реформирование экономики, по-прежнему у нас является чиновник. Ни одной стране по такой схеме на постиндустриальной стадии не удалось добиться положительных результатов. Если нынче в Беларусь и идет зарубежный бизнес, то вначале он ищет дороги в коридоры власти. А глава государства, лично принимая крупных бизнесменов, затем открыто заявляет: "Я решил", "Я допустил" и т.д. и т.п.

Или затронем такой прискорбный момент. За последние 9 лет количество граждан Беларуси, занимающихся бизнесом, практически не изменилось! А на вопрос "Вы бы пожелали своим детям связать свою жизнь с предпринимательством?" количество положительных ответов намного уменьшилось. Это и есть реальный итог усилий государства по улучшению бизнес-климата в стране.

Таблица 5. "Принимали ли вы когда-либо участие в частной предпринимательской деятельности?"

Вариант ответа	03'99	12'02	06'08
Участвовал и собираюсь участвовать далее	12.9	13.6	11.1
Участвовал, но продолжать не собираюсь	7.5	9.5	11.6
Не участвовал, но хотел бы участвовать	30.7	33.7	31.9
Никогда не участвовал и не собираюсь участвовать	48.8	42.0	44.7

Таблица 6. "Вы бы пожелали своим детям заняться частным бизнесом, связать свою жизнь с предпринимательством?"

Вариант ответа	11'99	12'02	06'06	06'08
Да	38.1	46.4	46.8	**32.6**
Нет	26.0	37.1	34.3	49.7
ЗО/НО	35.9	16.5	18.9	17.7

Таблица 7. "Как за последние два-три года изменились условия для занятия частной предпринимательской деятельностью в Беларуси?"

Вариант ответа	03'99	12'02	06'06	06'08
Условия улучшились	7.1	10.4	20.7	**9.3**
Ужесточилось законодательное регулирование	34.4	38.5	35.6	**50.8**
Усилился произвол со стороны государства	24.7	33.8	22.2	23.6

— Сергей Александрович, сегодня власть ведет речь о реанимировании процесса приватизации хозяйственных субъектов, их акционировании, а также привлечении больших объемов иностранных инвестиций. В текущей пятилетке планируется инвестировать в экономику более 80 млрд долларов (в 4 раза больше, нежели в предыдущей) и войти в тридцатку стран с наилучшей инвестиционной привлекательностью (сейчас по данному показателю Беларусь занимает лишь 110-е место). Как вы могли бы прокомментировать эти устремления?

— У нас власть принимает решения тогда, когда во что-то упирается лбом и не принять их уже просто невозможно. Когда, как говорится, жизнь берет за горло. Поэтому планируемое ускорение процесса приватизации и привлечения зарубежных инвестиций — вынужденная мера. Опять же, повторюсь, с целью выживания самой власти.

Но зададимся риторическим вопросом: на кого опирается белорусская власть? Как показывают соцопросы, в первую очередь на чиновников, силовые структуры и пенсионеров. На последнем же месте фактически всегда оказываются бизнесмены. Вы сказали о намерении войти в первую тридцатку стран по инвестиционной привлекательности. Но кто это может обеспечить? Три вышеназванные группы? Абсурд! Или еще. Представители властных структур твердят о необходимости повышения в ближайшем будущем средней зарплаты населения чуть ли не до одной тысячи долларов, прекрасно осознавая, что низкая зарплата — главный нарушитель стабильности государства. А каким способом? Скорее всего увеличением налоговой нагрузки на бизнес. Но это уже отдельная тема разговора.

Беседовал Игорь ГРИШАН.

Беларускія кропкі на карце Венесуэлы

Беларуска-венесуэльскае сумеснае прадпрыемства па вытворчасці трактароў будзе размяшчацца ў Барынасе, СП па выпуску грузавых аўтамабіляў — у Сан-Фернанда-дэ-Апурэ, а СП па вытворчасці кар'ерных самазвалаў — у штаце Балівар.

Аб тым, што ўжо вырашана пытанне размяшчэння сумесных прадпрыемстваў, аб'явіў пасля вяртання з Мінска ў Каракас прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес. Як адзначыў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла ў Беларусі Амерыка Дыяс Нуньес, венесуэльскі бок лічыць эфектыўным візіт Уга Чавеса ў Мінск.

Гэта быў трэці візіт Уга Чавеса ў Беларусь. Да гэтага венесуэльскі лідэр прыязджаў у Мінск у 2006-м і 2007 гадах. У снежні 2007 года адбыўся афіцыйны візіт у Венесуэлу прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

Газ падаражэў

Цэны за спажыванне прыроднага газу для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў з 1 жніўня павялічаны на 9,3%.

Як паведамілі БелаПАН у прэс-службе Міністэрства эканомікі, такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Мінэканомікі ад 24 ліпеня 2008 года №154.

Згодна з дакументам, з 1 жніўня юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі будуць плаціць 341 тыс. 140 рублёў (158,18 долара ў эквіваленце) за 1 тыс. куб. м замест раней устаноўленых 312 тыс. 140 рублёў (145,18 долара ЗША ў эквіваленце).

Совмин повысил бюджет прожиточного минимума

Постановлением Совета министров Республики Беларусь от 30 июля 2008 г. №1093 утверждены следующие размеры бюджета прожиточного минимума в среднем на душу населения и по основным социально-демографическим группам в ценах июня 2008 года в расчете на один месяц на период с 1 августа по 31 октября 2008 г.:

в среднем на душу населения — 224.700 руб.;

для трудоспособного населения — 246.210 руб.;

для пенсионеров — 196.080 руб.;

для студентов — 234.780 руб.;

для детей в возрасте от 3 до 16 лет — 266.310 руб.;

для детей в возрасте до 3 лет — 190.660 руб.

Структура бюджета прожиточного минимума в среднем на душу населения в ценах июня 2008 года по статьям расходов:

продукты питания — 54,3%;

плата за пользование жилым помещением и коммунальные услуги — 16,2%;

предметы гардероба — 14,7%;

бытовые и транспортные услуги — 6,8%;

товары бытового и хозяйственного назначения — 3,1%;

взносы и платежи — 3,0%;

предметы первой необходимости, санитарии и лекарства — 1,9%.

СДЕЛКА

Что ищет Turkcell в Беларуси?

На прошлой неделе появилась официальная информация о том, что самый молодой и маленький белорусский оператор сотовой связи — "БеСТ" — продан турецкой компании Turkcell. Правда, были проданы только 80% акций ЗАО "БеСТ". На продажу остальных 20% действует пятилетний запретный период. Показательно, что еще недавно высокопоставленные чиновники "Белтелекома" и Минсвязи категорически отрицали возможность сделки с Turkcell, называя любую информацию по этому поводу "беспочвенными слухами".

И вот что еще любопытно. Купив "БеСТ", компания Turkcell заплатила за каждого абонента "БеСТ" 4042 доллара, тем самым установив рекорд на сотовом рынке СНГ. Да и вообще, до сих пор на мировом рынке "сотовых" абонентов дороже оценивали только в Африке — в Гане и Нигерии.

В целом же финансовая составляющая сделки выглядит так: Turkcell заплатит белорусскому правительству 500 млн долларов. При этом 300 млн будут перечислены на протяжении 30 дней после подписания соглашения, 100 млн — в течение 2009 года и еще 100 млн — в 2010-м. Впрочем, разные источники приводят различную информацию о суммах выплат — от 400 до 600 млн долларов. К примеру, по данным Reuters, Turkcell заплатит за "БеСТ" дополнительные сто миллионов долларов, если по итогам 2008 года белорусский оператор получит чистую прибыль.

Кстати, Turkcell в официальном заявлении для прессы и инвесторов не преминул заметить, что покупка "БеСТ" "окажет незначительное влияние на величину консолидированных активов" турецкого телекоммуникационного гиганта.

Для сведения

ЗАО "Белорусская сеть телекоммуникаций" ("БеСТ") зарегистрировано 5 ноября 2004 года. Оказывает услуги сотовой связи стандарта GSM под торговой маркой "БеСТ" с 21 декабря 2005-го. В июле 2006 года компании стали доступны средства привлеченного через "Эксимбанк КНР" кредита в размере 234 млн USD для создания инфраструктуры оператора сети мобильной связи стандарта GSM 900/1800. В ноябре 2006 года началась кампания по активному привлечению абонентов. На 1 июля 2008 года абонентская база составляла 187 тыс. человек (3% белорусских абонентов).

Услуги связи БеСТ доступны в 80 населенных пунктах Беларуси, на территории, где проживает 68,8% населения страны. Выручка (2007 год) — 1,6 млн USD. Задолженность — 234 млн USD.

Turkcell — ведущий турецкий оператор сотовой связи стандарта GSM. Абонентская база — 35 млн человек (57% рынка). Также Turkcell имеет долю в GSM-операторах Азербайджана, Грузии, Казахстана, Молдовы, Украины и Северного Кипра. У Turkcell уже есть опыт работы в СНГ — в частности, компания контролирует украинский "Астелит".

Крупнейшие акционеры Turkcell: TeliaSonera (37,07%), Cukurova Holding (13,8%), "Альфа-групп" (6,63%) и казахская Visor Holding (6,63%). Выручка (2007 год) — 6,3 млрд долларов. Чистая прибыль (2007 год) — 1,4 млрд долларов. Капитализация — 16,7 млрд долларов.

Комментарии

Сделку по продаже 80% акций "БеСТ" прокомментировали ее участники. По словам председателя Государственного военно-промышленного комитета Беларуси Николая Азаматова, белорусская сторона получила аналогичные предложения от компаний из многих стран мира, но, когда была проанализирована деятельность Turkcell и особенно качество подготовки специалистов в области бизнеса и коммуникаций, выбор был сделан в пользу этого турецкого оператора. Цитата: *"Мы считаем, что эта сделка очень выгодна и для Turkcell, и для Республики Беларусь. Осталось все осуществить до конца"*. Азаматов также пояснил, что поскольку белорусская сторона за 80% акций ЗАО "БеСТ" получит в общей сложности 600 млн долларов, то сегодняшняя стоимость "БеСТ" составляет 750 млн долларов. Кроме этого, по словам председателя комитета, Turkcell намерен дополнительно инвестировать 400 млн долларов в развитие белорусского оператора.

Министр связи Николай Пантелей в свою очередь заявил: *"Я полагаю, что усиление конкуренции на рынке — это всегда польза для самого рынка и, что самое главное, для потребителей соответствующих услуг. Причиной этой сделки явились не какие-то проблемы с развитием "БеСТ": у нас были ресурсы, чтобы развивать эту компанию, но потребовался дополнительный импульс, так как две другие наши компании стандарта GSM последние годы развивались достаточно активно. По обеим компаниям покрытие территории составляет 90%. Это феноменальный результат. На сегодняшний день мы приближаемся к 8 млн абонентов мобильной связи. Рынок уже почти разделен, но ресурс около 1 млн абонентов еще есть. Но самое главное — есть новые технологии, 3-го поколения, на подходе технологии 4-го поколения. Я думаю, что борьба должна быть не за отвлечение абонентов от одной компании к другой, а за счет наращивания объемов выручки, использования новейших технологий, сервисов. Минсвязи в состоянии регулировать рынок таким образом, чтобы все компании на белорусском рынке развивались в равной конкурентной борьбе и чтобы бизнес был успешным"*.

А гендиректор Turkcell Мехмет Сюрайа Джилив сказал: *"Мы очень рады сотрудничать с Беларусью и считаем, что подписание соглашения будет являться очередным шагом к еще более плодотворному сотрудничеству между нашими странами. Мы пришли в Беларусь для того, чтобы инвестировать, мы пришли как хорошие партнеры и считаем, что республика имеет достаточно высокий потенциал развития как в сфере экономики, так и в технологиях. Кроме того, белорусские специалисты обладают высоким интеллектуальным потенциалом. Учитывая все это, мы хотели бы сделать из БеСТ одну из самых лучших компаний мира"*.

Цифры

Практически одновременно с подписанием договора с турками Министерство связи и информатизации опубликовало отчет о состоянии рынка мобильной связи в Беларуси. В нем говорится, что сейчас в стране работают четыре оператора сотовой подвижной электросвязи. При этом, правда, рынок фактически поделен между "МТС-Беларусь" (53% абонентов) и Velcom (44%).

Общее количество белорусских абонентов на 1 мая 2008 года превысило 7,3 миллиона. Сотовой связью охвачено более 90,1% территории страны, на которой проживает более 97,7% населения, в том числе 100% городского. В сотовых сетях установлено 6588 базовых станций и 822 башни связи. В рамках реализации Государственной программы возрождения и развития села на 2005—2010 годы сотовой связью покрыты 870 сельских населенных пунктов, подлежащих преобразованию в агрогородки.

Версии

Конечно, главный вопрос, который интересует всех: "Зачем турки заплатили такие большие деньги за самого убогого белорусского оператора?" Действительно, слишком уж маловероятно, что "БеСТ" в обозримом будущем начнет приносить прибыль, даже если на него в приказном порядке переведут всех белорусских чиновников. А при нынешней выручке покупка "БеСТ" оправдает себя только через... 480 лет!

Достаточно правдоподобную версию событий назвали российские эксперты: покупая "БеСТ", Turkcell закрывает дорогу на белорусский рынок российским конкурентам — "Вымпелкому" и "Мегафону". Интриги добавляет тот факт, что у всех трех компаний есть общий акционер — российская "Альфа-групп" (6,6% Turkcell, 44% "Вымпелкома" и 25,1% "Мегафона"). Тем не менее в "Мегафоне" заявили, что их компанию "никогда не интересовал белорусский рынок", а пресс-секретарь "Вымпелкома" и вовсе воздержался от комментариев. В свою очередь директор по связям с общественностью компании МТС Елена Кохановская сказала: "Мы надеемся, что активный выход на рынок нового игрока не повлечет за собой демпинг и ценовые войны".

Интернет-издание Onliner оперативно опубликовало комментарий директора Центра инвестиций в высокие технологии российской инвестиционной компании "ФИНАМ" Элины Юриной. По ее мнению, *"цена более 2,5 тыс. долларов за абонента — очень велика, особенно с учетом низкой рыночной доли "БеСТ" и высокого уровня проникновения в Беларуси... Выход в регион, особенно за счет такой покупки, должен стоить как минимум в два раза дешевле"*.

Также Элина Юрина считает, что реально *"БеСТ стоит не дороже 120 млн USD... В мире есть существенно более динамичные рынки, на которые, в частности, сейчас выходят российские компании... Вообще говоря, ARPU в Беларуси выше, чем в соседней Украине, а также, например, по данным МТС, чем в России. В этом плане рынок выглядит достаточно неплохо. ... Еще один плюс — небольшая территория [страны] при равнинном рельефе, что снижает затраты на формирование сети базовых станций. Минус Беларуси — высокое проникновение [мобильной связи] при небольшом населении"*.

По данным аналитиков "ФИНАМ", для успешного ведения бизнеса в Беларуси Turkcell понадобится инвестировать не менее 300—500 млн долларов.

Виктор ДЕМИДОВ.

КРЫМІНАЛ

«Пагарэў» на арэндзе

Уступіў у сілу прыгавор суда Фрунзенскага раёна Мінска, вынесены ў красавіку гэтага года ў дачыненні да дырэктара ТАА "ВеЛюНа". Расследаванне крымінальнай справы праводзіла пракуратура Мінскай вобласці.

Як паведаміла БелаПАН старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Таццяна Калініна, будучы службовай асобай, якая мае права на заключэнне дагавораў арэнды памяшканняў, абвінавачаны Ф. на працягу 2001—2007 гадоў атрымліваў хабары ад індывідуальных прадпрымальнікаў за спрыяльнае вырашэнне пытанняў аб заключэнні дагавораў арэнды памяшканняў або аб прадаўжэнні такіх дагавораў. Кіраўнік ТАА прызнаны вінаватым больш чым па 50 эпізодах атрымання хабару ў доларах ЗША і еўра на суму, эквівалентную 162 млн 796 тыс. 375 рублям.

Як зазначыла Т.Калініна, нягледзячы на непрызнанне падсудным сваёй віны, яна была даказана падчас папярэдняга следства і на судовым пасяджэнні. Працэс доўжыўся тры месяцы. Дапытаны прыкладна 30 сведак, прааналізаваны значны аб'ём дакументаў і іншых рэчавых доказаў. Суд пагадзіўся з пазіцыяй дзяржабвінаваўцы і кваліфікаваў дзеянні Ф. па ч.2 арт.340 КК як атрыманне хабару паўторна, шляхам вымагання. Бяздзеянням па службе (незаключэннем дагавораў арэнды, адмаўленнем у прадаўжэнні дагавораў, пагрозамі аб датэрміновым скасаванні дагавораў) кіраўнік ТАА ставіў арандатараў у такія ўмовы, пры якіх мог быць нанесены ўрон іх законным інтарэсам. Таму арандатары былі вымушаны даваць хабар.

Прыгаворам былому дырэктару прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на шэсць гадоў з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых або адміністрацыйна-гаспадарчых абавязкаў тэрмінам на пяць гадоў з адбываннем пакарання ў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. З яго таксама спагнаны ў даход дзяржавы коштавы эквівалент беспадстаўна набытай выгады — 162 млн 796 тыс. 375 рублёў.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

РЭГІЁН

«Беларусь» на продаж

Гродзенскі гасцінічны комплекс "Беларусь" з рэстаранам і гандлёвымі кропкамі да канца 2008 года будзе выстаўлены на аўкцыён. Пра гэта афіцыйна паведаміў аддзел камунальнай маёмасці і прыватызацыі Гродзенскага гарвыканкама.

Маёмасны комплекс гасцініцы складаецца з 7-павярховага цаглянага будынка з прыбудовай і падвалам, а таксама 2-павярховага памяшкання з прыбудовамі і падвалам. Цяпер спецыяльная камісія працуе над ацэнкай кошту аб'екта.

Акрамя гасцініцы на продаж плануецца прапанаваць 10 іншых аб'ектаў гарадской уласнасці. У тым ліку кафэ "Астра", якое будзе выстаўляцца на аўкцыён разам з абсталяваннем і інвентаром, і недабудаваны будынак аэравакзала ў вёсцы Абухава: 9-павярховае памяшканне агульнай плошчай больш як 15 тыс.кв.метраў.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЖНІЎНЯ 2008 г.

ПАЛЕМІКА

Палітык з дзвюма пазіцыямі насамрэч не мае ніякай пазіцыі, акрамя ўласнай выгады

Паважаная "Народная воля"! Як вядома, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу нашай краіны Вольга Абрамава — адна з самых вядомых палітыкаў у дэпутацкім корпусе. Гэтага ў яе не аднімеш (ды я і не збіраюся): яна выдатна валодае любой аўдыторыяй электарату. Многія спакушаюцца і лічаць яе сваёю заступніцай, нават шчырай дэмакраткай. Яна публічна выказваецца наконт таго, "што ўладай трэба дзяліцца" ("Народная воля", №83—84 ад 6 чэрвеня 2008 г.). Ну хто не падтрымае такое смелае па нашым часе меркаванне? Маўляў, гэта ж добра — надаць больш паўнамоцтваў ім, дэпутатам...

Але ў той жа самы час "палатніца" Абрамава апраўдвае недэмакратычны рэжым у краіне. Цытую яе словы, якія занатаваў карэспандэнт Сяргей Каралевіч: *"Сёння ў краіне няма той сітуацыі, якая была ў мінулым. Асноўная задача, якая тады вырашалася канцэнтрацыяй улады, — гэта ўмацаванне дзяржаўнай незалежнасці краіны, нарошчванне мускулаў у дзяржаве, стварэнне эканамічнай і палітычнай стабільнасці. Дзяржава, можна сказаць, ужо адбылася. Адбылася ў тым ліку дзякуючы звышканцэнтрацыі ўлады ў адным звяне"*.

Вось такую локшыну наўрад ці хатняга прыгатавання спадарыня Абрамава ў чарговы раз вешае на вушы электарату. А ён слухае і, магчыма, верыць.

Цікава, а якая ж такая *"сітуацыя была ў мінулым"?*

Тое, што тады, на пачатку 90-х, паступова адчыняліся беларускамоўныя школы? Што краіна пасля больш як двухсотгадовай каланізацыі вярнула свае нацыянальныя сімвалы — стрыжань дзяржаўнасці? Тое, што беларускі народ паступова пачынаў адчуваць сябе нацыяй, а не дурным быдлам? Тое, што нас пачалі прызнаваць у свеце як роўную сярод роўных дзяржаву? Тое, што ўпершыню ў гісторыі нашу краіну наведаў прэзідэнт ЗША Біл Клінтан (гэта была асабліва знакавая падзея для Беларусі)? Тое, што мы нарэшце пачулі і ўбачылі праўду пра Курапаты, даведаліся пра злачынствы мінулага камуністычнага рэжыму? Тое, што нарэшце народ расшмаргнуў на сваёй шыі пятлю рабства і пачаў дыхаць воляй? Тое, што многія радаваліся першым парасткам дэмакратыі, беларускай дзяржаўнай незалежнасці?

Згодна з тэорыяй спадарыні Абрамавай, умацаванне дзяржаўнай незалежнасці краіны, выходзіць, фактычна азначае тое, што адбылося насамрэч, напрыклад: скасаванне дзяржаўнай мяжы з боку Расіі (што адкрывае шлях шматлікаму крыміналу аж да Ціхага акіяна ператвараць нашу краіну не проста ў прахадны двор, а, прабачце, у смярдзючую каналізацыю); стварэнне нейкай незразумелай "Саюзнай дзяржавы"... Што гэта такое, ніхто не можа дакладна растлумачыць. Не выключана, што пад гэтым кодам маецца на ўвазе неакаланізацыя Беларусі, а на дыпламатычным узроўні — сварка ледзь не з усімі суседзямі, якія нібыта "ідуць не ў нагу", і толькі адна Беларусь — у нагу...

У свой час А.Лукашэнка, даючы інтэрв'ю для немецкай газеты "Handelsblatt", ухваляў гітлераўскую Германію як узор для Беларусі. Сёння спадарыня Абрамава ўхваляе нарошчванне "мускулаў" — падобна, сілавых — у дзяржаве. Сапраўды, гэтыя "мускулы" выдатна справіліся з Юрыем Захаранкам, Віктарам Ганчаром, Анатолем Красоўскім, Дзімам Завадскім... За сваю грамадзянскую пазіцыю ад гэтых "мускулаў" пакутуюць у вязніцах сапраўдныя патрыёты нашай Бацькаўшчыны Аляксандр Казулін, Андрэй Кім, Сяргей Парсюкевіч і шмат іншых, адданых Беларусі грамадзян. У іх гэтыя "мускулы" ужо аднялі здароўе, зрабілі калекамі, многіх пазбавілі Радзімы, змусіўшы эміграваць. А мноства іншадумцаў, выгнаных з працы, пазбаўлены разам з сем'ямі сродкаў для існавання. Гэтыя "мускулы" не пашкадавалі нават беларускіх дзяцей з Коласаўскага ліцэя, перакрэсліўшы канстытуцыйнае права атрымліваць адукацыю на роднай мове.

Гэтыя "мускулы", парушаючы закон, забралі права народа на атрыманне праўдзівай інфармацыі. Цікава, ці ведае спадарыня Абрамава, у якой яшчэ еўрапейскай краіне, дзе яна нярэдка бывае, самая папулярная незалежная газета друкуецца за яе межамі? "Народная воля", якую народ па праву лічыць глытком чыстага паветра, промнем святла і праўды, вымушана друкавацца ў суседняй краіне. Вось яна, праўда і шчасце "мускулаў". А як гэтыя "мускулы" жорстка распраўляюцца з мірнымі дэманстрантамі — жанчынамі, моладдзю, людзьмі сталага веку — проста жах і сорам перад усім светам. А на разуменне спадарыні Абрамавай выходзіць — гэта ўмацаванне дзяржаўнасці.

Вось так, спадарыня Вольга…

Далей дэпутат сцвярджае, быццам стварэнне эканамічнай і палітычнай стабільнасці — гэта ўжо пройдзены этап. Але як тады разумець, што сродкі, накіраваныя ў сельскую гаспадарку, перавышаюць сам даход ад гэтай галіны эканомікі? Гэта і ёсць славутая, разрэкламаваная "эканамічная стабільнасць" і "адраджэнне вёскі"? А чвэрць прадпрыемстваў краіны афіцыйна прызнаных стратнымі, — таксама праява эканамічнай стабільнасці? І галоўнае, зноў жа засведчанае афіцыйнай статыстыкай, толькі не названае сапраўдным імем: Беларусь інтэнсіўна вымірае. Гэта, пэўна, таксама вынік "эканамічнай стабільнасці".

З гэтай нагоды прывяду адзін дакладны прыклад. Да 1995 года насельніцтва Пружаншчыны складала больш як шэсцьдзесят пяць тысяч чалавек. На канец 2007 года — пяцьдзесят дзевяць тысяч. І гэта пры тым, што ў раёне штогод асядае прыкладна 300—400 эмігрантаў, якія ў большасці сваёй чамусьці не прыстасаваны да актыўнай працы.

Тое, што самыя магутныя дзяржаўныя прадпрыемствы краіны трапілі ў поле зроку і апетытаў расійскага бізнесу, — гэта што, вяршыня эканамічнай стабільнасці Беларусі?

Далей спадарыня Абрамава падкрэслівае: *"Дзяржава, можна сказаць, ужо адбылася"*. Ці не дзіўна тое, што ніхто пакуль яшчэ гэтай дзяржавы не бачыў? Хто можа паказаць, дзе яна, гэтая дзяржава?

Нават шкаляр-пачатковец і той ведае, што дзяржава — гэта супольнасць людзей, аб'яднаных мовай, культурай, гісторыяй, нацыянальнымі гістарычнымі сімваламі і традыцыямі, дзяржаўнай мяжой, адпаведнай нацыянальнай валютай (у нас жа нейкі сурагат), нацыянальным войскам (у нас яно засталося савецкім). Нічога гэтага і блізка няма! Беларусь як была раней расійскай калоніяй, так, на мой погляд, і застаецца. А ў "Саюзнай дзяржаве" яшчэ больш страціць сваю самастойнасць. Вось суседнія Латвія, Літва, Эстонія сапраўды адбыліся як дзяржавы. Імкліва ідзе працэс замацавання незалежнай дзяржаўнасці Грузіі, Украіны і іншых былых расійскіх калоній. На вялікі жаль, толькі адна Беларусь пакутна і моўчкі памірае ў кіпцюрах двухгаловага арла.

Добра вядома, што спадарыня Абрамава ніколі і не хавала таго, што з'яўляецца прарасійскім палітыкам у беларускім парламенце. У сваёй кнізе "Беларусь: ні Еўропа, ні Расія" на старонцы 175 прама аб гэтым гаворыць. Цікава, а ці ведае яна, як называецца палітык, які гатовы служыць на карысць чужой краіне, можа быць, нават больш, чым сваёй?

З павагай —

Мікола КАНАХОВІЧ,
афіцэр у адстаўцы.

г.Пружаны.

Сяргей Гаргун збірае «ленінаў»

Ва універмагу "Слуцк", самым буйным у горадзе, гадзіннікавых спраў майстар, былы "афганец" Сяргей Гаргун вось ужо трэці год рамантуе не толькі гадзіннікі, а і калекцыянуе адлітыя з дзюралю і латуні бюсты розных вядомых асоб пераважна савецкай эпохі.

Непасрэдна ў майстэрні, навідавоку адвёў для іх некалькі паліц. А пачалося з таго, што яго знаёмы прынёс і перадаў задарма бюст Леніна. А потым кліенты, што заходзілі ў майстэрню, сталі несці падобныя бюсты адзін за адным, нібы жадаючы пазбавіцца ад сімвалаў бальшавіцкай эпохі. Тут сёння набралася аж 40 бюстаў Леніна.

Сяргей лічыць, што ўсе яны будуць нагадваць наведвальнікам майстэрні аб імперыі СССР, што развалілася ў 1991 годзе.

Адгукніцеся, спонсары!

Да Касма-Даміянаўскай царквы, што адкрылася 14 гадоў таму на ўскраіне горада ў закінутым салдацкім клубе і зараз ззяе трыма купаламі, з двух'яруснай званіцай, пралягае вулачка метраў сто даўжынёй. Пасля дажджу яна блішчыць шматлікімі лужынамі ў выбоінах, таму як пакрыцё гравійнае. Наведвальнікі храма ў дні служб прыносяць туды на абутку пясок і гразь з той вулачкі. На просьбу святара Мікалая Коржыка да кіраўнікоў раёна пасадзейнічаць, каб яе заасфальтавалі, таму як сам, заняты капітальным рамонтам малітоўнай залы, сродкаў не мае, станоўчага адказу не паследавала.

У Слуцкім ЖКГ начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела, якому я пазваніў з такой нагоды, адказаў, што на добраўпарадкаванне вулачкі спатрэбіцца не меней за 20 мільёнаў рублёў, таму як адзін мазаўскі самазвал асфальтавай сумесі каштуе сто тысяч рублёў. Грошы з раённага бюджэту выдзеліць сёння няпроста. Надзея на спонсараў. Паблізу царквы заснаваны так званы "Тэхнацэнтр", камерцыйнае прадпрыемства па рамонце і афарбоўцы грузавых машын. Заказаў там хапае і прыбытак, вядома, ёсць. Вось бы і выдзеліць пэўную суму на асфальтаванне праезду да храма. Стагоддзямі па такім прынцыпе ў Беларусі ўзводзіліся нават храмы.

Міхаіл ТЫЧЫНА.
жыхар г.Слуцка.

КОЛОНКА ЮРИСТА

На вопросы читателей "Народной воли" отвечает юрист ***Олег ВОЛЧЕК***

Рядом с моим домом ведутся строительные работы. Каждое утро с 7 часов строители начинают работу. Из-за сильного шума во время стройки невозможно отдыхать у себя в квартире. Подскажите, с какого времени можно вести строительные работы?

Р.К.Эйдина,
жительница г.Минска.

С такой проблемой сталкиваются многие жители нашего города. К сожалению, не всегда строители руководствуются законами, которые запрещают им начинать работу с 7 часов утра. Согласно п.20 "Положения о порядке переустройства и перепланировки жилых помещений в многоквартирных жилых домах", утвержденного Постановлением Совета министров РБ от 31.12.2006 №1805, в период проведения переустройства и перепланировки помещения запрещается: производить в выходные и праздничные дни работы, создающие шум или вибрацию; начинать работы, создающие шум или вибрацию, ранее 9 часов и заканчивать их позднее 19 часов в рабочие дни; применять при производстве работ оборудование и инструменты, от работы которых уровень шума и вибрации превышает установленные санитарные нормы; загромождать и загрязнять строительными материалами и их отходами эвакуационные пути, другие вспомогательные помещения жилого дома; использовать пассажирские лифты для транспортировки строительных материалов и их отходов без упаковки.

Также надо учесть, что строительные организации обязаны применять технологическое оборудование, которое не должно создавать повышенный шум от работы. Мингорисполкомом совместно с проектными организациями были разработаны мероприятия по снижению уровня шума от работы технологического оборудования.

В первую очередь надо обратиться с заявлением в строительную организацию с предложением, чтобы они начинали строительные работы с 9 часов, как установлено законодательством. Если ваши пожелания не будут выполнены, то вы вправе обращаться с жалобой в местные исполнительные органы, на территории которых расположена строительная площадка. Я уверен, что после вашего обращения в строительную организацию работа будет начинаться с 9 часов.

Рядом с нашим домом начинают строительство административного здания. Нас многих это строительство не устраивает, поскольку будет уменьшена зеленая зона, прилегающая к нашему дому. Почему местная власть без опроса населения принимает такие решения? Как можно повлиять на местных чиновников, чтобы наша зеленая зона осталась нетронутой?

К.А.Запрудник,
житель г.Минска.

Уже было много случаев, когда граждане, объединившись для защиты своих прав, добивались результата. Несмотря на то, что стройка уже начинается, я хочу предложить одну форму участия граждан, которая поможет вам добиться того, чтобы зеленая зона осталась нетронутой.

Согласно ст.37 Конституции РБ, каждый из нас может влиять на принятие решений органами власти. Одной из такой форм влияния являются местные собрания как форма обсуждения вопросов государственной и общественной жизни. Компетенция местных собраний регламентирована Законами "О республиканских и местных собраниях" и "О местном управлении и самоуправлении". Инициаторами местного собрания могут быть не менее 10% граждан, постоянно проживающих на соответствующей территории. Местные собрания могут проводиться на территории административно-территориальной единицы или ее части (микрорайонов, жилищных комплексов, кварталов, улиц, дворов, поселков, сел и т.п.). Местное собрание правомочно, если в нем принимают участие не менее 25% граждан, достигших 18 лет. С правом совещательного голоса в собрании могут участвовать представители государственных органов, предприятий, учреждений, организаций.

В компетенцию местного собрания входит: рассмотрение вопросов, отнесенных к ведению органов местного управления и самоуправления, внесение по ним предложений, в том числе по установлению местных налогов и сборов; обсуждение проектов решений местных Советов депутатов, исполкомов по вопросам местного значения в экономической, социальной и культурной областях; внесение предложений по вопросам повестки дня сессий местных Советов депутатов, заседаний исполкомов; рассмотрение предложений о наименовании и переименовании населенных пунктов и их составных частей и принятие по ним рекомендаций; обсуждение мер по укреплению (охране) общественного порядка; рассмотрение проектов планов развития и застройки соответствующих территорий, рационального использования природных ресурсов; принятие решений об учреждении и упразднении органов территориального общественного самоуправления, избрании членов и утверждение уставов этих органов; обсуждение других вопросов, в том числе республиканского значения, затрагивающих интересы населения соответствующей территории.

Собрания вправе обращаться в государственные органы, на предприятия, в организации, учреждения и объединения, которые обязаны рассмотреть эти обращения и информировать граждан, проживающих на соответствующей территории, о принятых по ним решениях.

Я упомянул лишь только об одной форме влияния жителей на решения местных властей. Также граждане могут добиваться своих прав через создание комитетов общественного самоуправления, местные референдумы, избрание депутатов в Минский городской Совет депутатов по своему округу. Об всех этих формах работы необходимо более расширенно рассказать, но в вашем случае надо бросить все усилия на проведение местного собрания, если хотите в ближайшее время отстоять зону отдыха.

ЧЫТАЧ —ГАЗЕТА

Чаму гэта нашу краіну і зараз клічуць "Белоруссией"?

Як вядома, згодна з Канстытуцыяй нашай краіны, яе ўзаконены, афіцыйны назоў — Рэспубліка Беларусь або, у скарочаным выглядзе, проста Беларусь. Прычым "БЕЛАРУСЬ" і ў рускамоўным варыянце!

Але ж расійцы, у тым ліку і выступоўцы, каментатары расійскіх тэлеканалаў, пішучая брацця ўпарта і паслядоўна клічуць нас "Белоруссией". Што, так цяжка даведацца, як насамрэч імя дзяржавы, якую яны прагна цягнуць у "саюзныя" абдымкі?

Такое непаважнае стаўленне да сучаснага назову нашай дзяржавы мяне, грамадзяніна Беларусі, папросту абражае. Ніяк не даўмеюся, у чым тут справа. Можа, шаноўны пасол Расійскай Федэрацыі ў нашай краіне сп.Сурыкаў змог бы ўнесці яснасць на гэты конт?

Буду ўдзячны за адказ.

Яўген ГАЛЯКЕВІЧ,
жыхар г.Пружаны.

Ад рэдакцыі

Шаноўны спадар Галякевіч! Да хвалюючага Вас (і не толькі Вас) пытання "Народная воля" звярталася не раз. Вось і ў нядаўнім нумары за 10 ліпеня змешчаны артыкул "Хіба наша мова такая, што ў сур'ёзных выпадках ёю нельга карыстацца?" Яўгена Майсейчыка. Цытуем фрагмент артыкула:

"...А цяпер, на фоне абсалютнага панавання ў беларускім грамадстве рускай мовы, разгледзім вельмі павучальны прыклад назвы нашай дзяржавы "БЕЛАРУСЬ", запісанай у адназначным напісанні і гучанні ў беларускамоўным і рускамоўным тэксце нашай Канстытуцыі. Аднак гэты заканадаўча зацверджаны тэрмін "Беларусь" на абшарах суседняй дзяржавы — Расіі выкарыстоўваўся толькі да 17.08.1995 г., бо з гэтага дня пачало дзейнічаць распараджэнне тагачаснага высокапастаўленага чыноўніка Адміністрацыі прэзідэнта Расійскай Федэрацыі С.Красаўчанкі №1495 аб напісанні назваў 14 дзяржаў — былых рэспублік СССР і іх сталіц. Паралельна ў Расійскай Федэрацыі была праведзена адпаведная тэрміналагічная праца, у выніку якой інстытут "ВНИИКИ" Дзяржстандарту Расіі і аб'яднанне "ИнформВЭС" Міністэрства замежных эканамічных сувязяў Расіі распрацавалі Агульнарасійскі класіфікатар краін свету ("ОКСМ"), які быў уведзены ў дзеянне пастановай Дзяржстандарту Расіі ад 27.12.1995 года №641. У выніку для рускамоўнай прасторы была ўзаконена назва і нашай дзяржавы "БЕЛОРУССИЯ"..."

Здавалася б, якое дачыненне маюць расійскія законы да нашай моўнай практыкі? Ды вось не мною толькі заўважана: цяпер і ў вуснах беларускіх выступоўцаў усё часцей і часцей чуецца "Белоруссия". Так, суседняя краіна, яшчэ да аб'яднання з нашай, перайначвае нашы законы, не зважаючы на ўрон гонару грамадзян Рэспублікі Беларусь". А самі некаторыя нашы грамадзяне падрабляюцца, страціўшы годнасць, пад "старэйшую сястру".

Як бачым, турбаваць вельмі паважанага пасла РФ Аляксандра Сурыкава наўрад ці варта — вырашаць такія пытанні не ў кампетэнцыі паслоў, якія трымаюцца законаў сваёй дзяржавы. На жаль, кіраўнікі суседняй краіны, нягледзячы на заяўлены імі дэмакратычны курс і будаўніцтва "Саюзнай дзяржавы" з Беларуссю, чамусьці, як і ў камуністычныя часы, верныя традыцыі расійскіх самадзержцаў. А тыя, каб сцерці з гістарычнай памяці пакаленняў першароднае імя нашай краіны **ЛІТВА**, далі ёй назву "Белоруссия" (афіцыйна з 1840 па 1864 год). А потым і зусім перайменавалі ў "Северо-Западный край"...

Савецкая ўлада вярнула нам толькі "Белоруссию".Але з абвяшчэннем незалежнай, суверэннай краіны быў замацаваны назоў **БЕЛАРУСЬ**.

Праўда, ёсць людзі — і за мяжой, і дома, — каму наш закон не пісаны...

НАБАЛЕЛА

Наша мова — гэта падмурак дома, без якога ён рухне

Геній паэзіі Адам Міцкевіч, чыё 210-годдзе сёлета будзе адзначаць грамадскасць Беларусі, калісь назваў беларускую мову "самай гарманічнай і багатай з усіх славянскіх моў і найменш змененай".

І гэта сапраўды так. Мовай, дадзенай нам ад Бога, карысталіся ў сваёй асветніцкай дзейнасці Кірыла Тураўскі, Францішак Скарына, Сымон Будны. На нашай цудоўнай мове напісаны неўміручыя творы народных песняроў Янкі Купалы і Якуба Коласа. Наша мова — гэта падмурак Беларускага дома, знікне яна — рухне ўвесь будынак.

На вялікі жаль, пра гэта не думаюць (ці не жадаюць думаць?) не толькі шараговыя грамадзяне і дзяржаўныя мужы ўсіх узроўняў, не кажучы ўжо пра асобных беларусафобаў пячорнага кшталту. Нядаўна я ішоў разам з рэдактарам аднаго часопіса па адной з вуліц Мінска, мы вялі гамонку па-беларуску. Раптам нас спыніў мажны, добра апрануты грамадзянін пенсіённага ўзросту і грозна запытаў: "Почему вы разговариваете на белорусском языке, а не на русском? Вы кто, бээнэфовцы или писатели?" Давялося спыніцца і ветліва-цярпліва даводзіць, што мы — беларусы, знаходзімся ў сваёй сталіцы, і мова, на якой мы размаўляем, наша, родная, да таго ж дзяржаўная... У адказ пачулі, што сваёй мовай мы, ці бачыце, дэстабілізуем становішча, стараем напружаныя адносіны ў грамадстве і што мы ледзь не экстрэмісты. Назваць сваё прозвішча гэты рускі шавініст адмовіўся, але сказаў, што ён палкоўнік у адстаўцы, служыў у Расіі, потым працаваў у Беларусі ў міліцыі. Карацей, "просветил", якія мы ёсць ворагі народа. І няўцям унтэр-прышыбееву (не дай Бог такому ў рукі хоць дубальтоўку, хоць рагатку), што якраз такія, як ён, сеюць злое насенне ў грамадстве, абражаюць нацыянальную годнасць людзей і гонар беларускай дзяржавы, дзе спрадвеку — паважлівае стаўленне да грамадзян розных нацыянальнасцяў.

На мой погляд, негатыўныя адносіны да рускіх з боку некаторай часткі карэнных жыхароў краін Балтыі стварылі менавіта вось такія "асветнікі", якія вучылі іх у савецкія часы, як ім жыць і размаўляць. Цікава, як адрэагавалі б на заварот "говорите по-русски" карэнныя жыхары іншых краін? Думаю, самы агрэсіўны шавініст на тое там бы не адважыўся. А ў Мінску ці ў другім кутку Беларусі — выходзіць, можна? Мы што, жывём на акупаванай тэрыторыі?

Успомніўся адзін даўні эпізод 1990 года падчас перадвыбарнай кампаніі кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларусі 12-га склікання, вядомага грамадскага дзеяча і буйнога навукоўца Юрыя Хадыкі. Тады таксама нейкі палкоўнік у адстаўцы і выхадзец з Расіі злосна крычаў, што вось, маўляў, гэтыя беларусы нядаўна вылезлі з пячор і балот і рвуцца да ўлады, што асвету і культуру сюды прынеслі выключна расійцы. Лічу, што такіх злосных беларусафобаў — адзінкі, і што большасць жыхароў нашай краіны, прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў, у тым ліку выхадцы з Расіі, паважаюць нас, беларусаў, і нашу мову, як мы паважаем іх. Так і павінны жыць добрыя людзі.

Часам можна пачуць, што Беларусь — малодшая сястра Расіі. А ці так? Калі яшчэ не было ні Масквы, ні іншых рускіх гарадоў, на нашых землях ужо існавалі Полацк, Тураў, Менск, Орша, Барысаў, Лагойск і шмат іншых гарадоў. А хто, як не нашы выдатныя майстры, прыкладам, Сцяпан Палубес са Мсціслава і іншыя, аздаблялі ўсім на здзіў маскоўскі Крэмль і саборы Белакаменнай? Хто, як не наш асветнік Сімяон Полацкі, быў выхавальнікам і настаўнікам Пятра І? Гэта наш вялікі князь ВКЛ Ягайла, кіруючы мужнымі ваярамі, разграміў ушчэнт крыжакоў у Грунвальдскай бітве і выратаваў нашу і расійскую землі ад нашэсця. А пры Вялікім князі ВКЛ Альгердзе краіна з дзяржаўнай беларускай мовай была адной з буйнейшых у Еўропе і прасціралася ад Чорнага да Балтыйскага мораў. Не, Беларусь не малодшая сястра Расіі. А што тычыцца сваяцкіх адносін, дык сёстры жывуць разам у бацькоўскай хаце толькі ў маленстве, а затым, пасталеўшы, ладзяць самастойнае жыццё, застаючыся звычайна ў добрых адносінах між сабой.

Гэта я наконт магчымага аб'яднання з Расіяй. Калі ж, не дай Бог, у аб'яднанай дзяржаве прыйшлі б да ўлады вось такія палкоўнікі-"асветнікі", дык хопіць ліха ўсім, не толькі беларусам. Дэталізаваць не стану, кожны можа ўявіць сабе тую карціну. Мы ўжо і так даўно адчуваем шалёны ціск на ўсё беларускае. (Рыхтуемся да дзяржаўнасаюзных абдымкаў?)

Газета для вясковых жыхароў "Белорусская нива" друкуецца на рускай мове. Спыніла сваё існаванне беларускамоўная газета "Голас Радзімы", замест якой існуе толькі 4-старонкавы ўкладыш у "Minsk Times". У шапіках "Саюздруку" нашага Дзяржынска і, не выключаю, у іншых райцэнтрах няма ў продажы газеты "Звязда", "Літаратура і мастацтва", часопісаў "Родная прырода", "Роднае слова", "Беларускі гістарычны часопіс" і іншых беларускамоўных выданняў, затое залежваецца, а затым спісваецца шэраг рускамоўных выданняў.

Неяк прадавец газетнага шапіка сказала, што калі была ў продажы газета "Народная воля", дык з выканаццем плана не было праблем. Гэтую газету раскуплялі ў адзін момант. А зараз такое папулярнае сярод насельніцтва выданне вымушана друкавацца ў Смаленску. Ганьба і сорам!

Веру і маю надзею (надзея, як вядома, памірае апошняй), што Беларусь усё ж здолее стаць сапраўды незалежнай. У такой краіне хопіць месца людзям усіх нацыянальнасцяў. На мовах і рускіх, і ўкраінцаў, і палякаў, і цыган, і татараў будуць выходзіць газеты і часопісы, для іх дзетак адчыняцца школы, як тое было падчас кароткай, на жаль, дзейнасці ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі. Але адзінай дзяржаўнай мовай, якую павінны будуць паважаць усе і абавязкова вывучаць беларусы, а дзяржслужбоўцы дасканала валодаць ёю, будзе мова тытульнай нацыі. І прарочыя словы выдатнага паэта-адраджэнца Францішка Багушэвіча будуць гучаць як дэвіз і запавет: "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не умёрлі!"

Жыве Беларусь!

Лявон ЦЕЛЕШ,
жыхар г.Дзяржынска.

ИДЕЯ

Не хочешь в армию — иди работать на ферму

Я вот подумал: а почему бы не ввести альтернативную службу для сельских парней. Во многих колхозах, совхозах, различных СПК катастрофически не хватает кадров — животноводов, механизаторов, строителей. Многие из тех ребят, которые выросли в деревне, но хотят податься в город, вполне могут задержаться на полтора-два года для прохождения так называемой альтернативной службы в местных условиях, тое есть вместо армии пусть работают на фермах трактористами, шоферами, строителями. Глядишь, и некоторые передумали б ехать в город, остались на постоянное место жительства в селе. И не пришлось бы тянуть на те же фермы, в мехмастерские так называемых "химиков", то есть осужденных.

Александр ПЕСТРЯКОВ,
житель пос.Черницкий
Смолевичского района.

Народная Воля http://www.nv-online.info
7 ЖНІЎНЯ 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

